Источник: **«Культура» - 2012-06-09**

## Слова пра Гарэцкіх

Міжнародная навуковая канферэнцыя чакаецца днямі ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

Мяркуецца, што юбілейныя, XX Гарэцкія чытанні збяруць даследчыкаў творчасці пісьменніка Максіма Гарэцкага і яго не менш вядомага брата, геолага, географа і эканаміста, аднаго з заснавальнікаў і акадэмікаў Акадэміі навук, Гаўрылы Гарэцкага. Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх.

Трэба адзначыць, што кожны год у Чытаннях, якія праводзяцца з 1992-га, удзельнічае больш за 40 літаратуразнаўцаў, мовазнаўцаў, гісторыкаў - як з высокімі навуковымі ступенямі, так і толькі пачаткоўцы. Па выніках канферэнцыі плануецца выдаць зборнік матэрыялаў.